Еще одним выразительным средством, которое усиливает художественную ценность хореографического произведения, является реквизит. Под реквизитом понимаются «используемые при выступлении на сцене предметы, например: веер, оружие, музыкальные инструменты, пища и др., за исключением сценических декораций, костюмов и осветительных установок» [1, с. 108]. Реквизит отличается от сценических декораций, он свободно перемещается вслед за движениями танцующего, это составная часть формирования динамического визуального и общего хореографического образа.

Что касается роли, «танцевальный реквизит является вспомогательным методом создания образа персонажа и характера в танце, это мощный инструмент для формирования визуального пространства сцены и атмосферы» [2, с. 546]. Искусное использование реквизита не только может расширить размах движений и ощущение пространства в танце, раскрыть положение и статус персонажей, но и создать характерные особенности типовых ролей, обозначить отношения между ними. В балете реквизит зачастую становится средством описания драматического конфликта, стимулирования развития сюжета, а также вспомогательным методом изображения психологии персонажей. Эти функции реквизита делают передачу содержания и эмоций хореографического произведения более точной, тем самым усиливая художественную выразительность танца.

В китайском народном танце, в частности в танце народности хань, реквизит занимает очень важное место, он обладает особым функциональным значением. Некоторые танцы зависят от реквизита, для того чтобы раскрыть уникальные национальные черты, например: в танце «янгэ» народности хань используются веера и платок, в тибетском танце используется платок «хада» (хада, полотнище белого или голубого или красного тонкого шелка, у тибетцев и монголов подносится в знак приветствия, почтения, дружеских чувств при поздравлениях). Некоторые танцы называются непосредственно по названию реквизита, используемого в них, например: монгольские танцы с палочками и пиалами, ханьский танец с мечами. Ханьские танцы дракона и льва не могут быть исполнены без реквизита. Вместе с тем, танцевальный реквизит, как и движения танца, предъявляют высокие требования к технике, танцоры должны уметь искусно использовать реквизит, достигая единства и гармонии с ним. Однако танец отличается от циркового искусства и иллюзионизма, реквизит не должен заслонять собой собственную роль и ценность танца.

**Список литературы:**

1. 杜定宇. 英汉戏剧辞典上海上海艺文出版社=Ду, Динъюй. Английско-китайский театральный словарь / Динъюй Ду. – Шанхай : Издательство Шанхайской литературы и искусства, 2013. – 619 с.
2. 王克芬. 中国舞蹈大辞典北京文艺出版社= Ван, Кэфэнь. Словарь китайского танца / Кэфэнь Ван. – Пекин : Искусство, 2010. – 845 с.

***Дана Струнеўская***

**ВЯСНОВЫ ДЭСАНТ У ПАМЕРАНІЮ *(з досведу еўрапейскіх фальклорных фестываляў і конкурсаў)***

*У артыкуле прааналізаваны вопыт папулярызацыі і актуалізацыі фальклору на XIV Міжнародным пасхальным фестывалі «Лобецка Баба» («XIV Łobeska Baba Wielkanocna»), куды гмінай мястэчка Лобез у Памераніі былі запрошаны, сярод іншых удзельнікаў, студэнты-фальклярысты БДУКМ.*

***Dana Strunevskaya***

**SPRING LANDING IN POMERANIA *(from the experience of European folklore festivals and competitions)***

*The article analyzes the experience of popularization and actualization of folklore at the XIV International Easter Festival "Lobetska Baba" ("XIV Łobeska Baba Wielkanocna"). Students-folklorists of the Belarusian State University of Culture and Arts were invited, among other participants, to this festival.*

Паме́ранія – гістарычная вобласць на поўдні Балтыйскага мора, якая знаходзілася ў розныя эпохі ў складзе розных дзяржаў. Электронныя інфармацыйныя крыніцы апавядаюць, што: «…назву Памеранія (па-славянску "Поморянія" або "Памор'е") мясцовасць атрымала па назве насяляючай вобласць заходнеславянскай племяннной групы памаран. У цяперашні час Заходняя Памеранія ўваходзіць у склад германскай зямлі Мекленбург-Пярэдняя Памеранія, астатняя частка з'яўляецца польскай тэрыторыяй» [2]. З 23 па 25 сакавіка 2018 года ў мястэчку Лобез у Памераніі аргкамітэтам па арганізацыі міжнародных фестываляў, конкурсаў выканаўцаў і навуковых канферэнцый была ў чарговы раз праведзена масавая і добра вядомая як у Польшчы, так і ў суседніх краінах падзея: XIV Міжнародны велікодны фестываль «Łobeska Baba Wielkanocna». Мерапрыемства вядома тым, што рэгулярна дэманструе культурныя каштоўнасці ўсіх народаў, музыканты, танцоры, спевакі і даследчыкі традыцыйнага мастацтва якіх збіраюцца на некалькі дзён напярэдадні Вялікадня на Польскім Памор'е для культурнага абмену. 2018 год быў знакавым тым, што ў рамках фестывалю праводзіліся: V Міжнародная навуковая канферэнцыя «Cymbały jako społeczny i kulturowy atrybut narodowej i międzynarodowej kultury artystycznej. Ewolucja, cechy artystyczne, perspektywy» («Цымбалы як сацыяльны і культурны атрыбут нацыянальнай і міжнароднай мастацкай культуры: эвалюцыя, мастацкія асаблівасці, перспектывы»); а таксама – Міжнародны конкурс фальклорных груп і цымбалістаў. Як лічылі арганізатары імпрэзы, конкурс павінен унесці істотны ўклад у дэманстрацыю лепшых нацыянальных дасягненняў гэтага маштабнага творчага форуму, стварыць на ім эмацыйную і жывую атмасферу дабразычлівага спаборніцтва.

Для ўдзелу ў ім ад Беларусі (чыё старажытнае насельніцтва культурна і генетычна знітавана з паморскімі старажытнымі культурамі балтаў і славян [1, с. 28–29]) запрасілі дэлегацыю ў складзе фальклорных гуртоў «Страла» (кіраўнік Эвеліна Шчадрына), «Этнасуполка» (кіраўнік Таццяна Пладунова) кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ; асобных салістаў-інструменталістаў з горада Заслаўе; групы навукоўцаў-даследчыкаў народнага мастацтва і культуры Беларусі з БДУКМ: прафесар Аляксандр Карацееў, дацэнт Вячаслаў Калацей, старшыя выкладчыкі Таццяна Пладунова і Эвеліна Шчадрына.

Разам з калегамі з Польшчы, Германіі, Расіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Украіны і Бельгіі нашы педагогі абмеркавалі розныя аспекты генезісу, бытавання, інкультурацыі ў сучаснасць такога архаічнага па паходжанні і варыятыўнага ў розных частках Свету музычнага інструмента-хардафона, як цымбалы. Акрамя даследчыкаў з Беларусі, свае даклады прадставілі іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калегі з іншых краін. Вельмі ўразіў слухачоў даклад антраполага і музыказнаўцы Багдана Матлаўскага (мал.3) пра цымбалы на Паморʼі, а бельгіец Ёзеф Ратайчак падзяліўся звесткамі пра сваё супрацоўніцтва (у кантэксце вывучэння цымбал) з «легендай» еўрапейскай фалькларыстыкі Золтанам Кодаем. Беларускія паведамленні таксама прымаліся з увагай і добразычлівасцю, а ўвогуле «складнік Беларусі» на навуковай частцы форуму выглядаў наступным чынам (таб. 1).

Арганізатары наладзілі імпрэзу, забяспечылі ўдзельнікаў усім неабходным, арганізавалі экскурсію ў мясцовы марскі порт і адну з аграсядзіб. Выканаўчы дырэктар і мастацкі кіраўнік Міжнароднага Велікоднага Фестывалю «Лобецка Баба» – польскі музыка, фалькларыст і дырэктар Лабецкага цэнтра культуры Дарыюш Адам Ледзіён (мал. 3) – рэгулярны ўдзельнік канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор» у БДУКМ, на якой мы з ім і пазнаёміліся. Удзел у праекце стаў пазнавальным для студэнтаў БДУКМ, паколькі мы мелі магчымасць прадэманстраваць свае навыкі і творчыя здольнасці за межамі краіны, alma mater і асяродкаў уласнай фальклорнай традыцыі, параўнаць свой фальклор з фальклорам іншых народаў. Трапіць на ўзбярэжжы, у ваколіцах якога знаходзіцца востраў Руген – легендарная сакральная выспа славян, пра якую мы вучылі наратыў старабеларускіх замоў («На моры-акіяне, на востраве Руяне…») і слухалі лекцыі па этнагенезе [1, с. 28], – было вельмі адказна і хваляўніча.

Табліца 1 – Даклады беларускай дэлегацыі на канферэнцыі ў Лобезы

| Дакладчык | тэма паведамлення |
|---|---|
| ***Карацееў Аляксандр,*** *прафесар, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, член Праўлення Беларускага Саюза музычных дзеячаў (Мінск, Беларусь)* | **Рэалізацыя функцыянальных асаблівасцяў беларускіх цымбалаў у кантэксце канцэртна-інструментальнага выканальніцтва: народна-інструментальнае музіцыраванне, традыцыйныя народныя духавыя інструменты, духавы аркестр** |
| ***Калацэй Вячаслаў,*** *дацэнт, кандыдат культуралогіі, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага Союза музычных дзеячоў (Мінск, Беларусь)* | **Дыятанічныя цымбалы ў мастацка-культурнай прасторы Беларусі ХХ-ХХІ стагоддзя** |
| ***Красулін Вячаслаў,*** *магістр мастацтвазнаўства, выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага Союза музычных дзеячоў (Мінск, Беларусь),* | **Сучасныя носьбіты традыцыі цымбальнага выканальніцтва Падзвіння Беларусі ў экспедыцыйных матэрыялах БДУКМ** *(даклад зачытаны калегамі)* |
| ***Казаніна Віёла****, магістр мастацтвазнаўства, аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў БДУКМ (Мінск, Беларусь)* | **Дыятанічныя цымбалы ў мастацкім калекцыянаванні і на арт-рынку антыкварыяту Беларусі** *(даклад зачытаны калегамі)* |
| ***Пладунова Таццяна,*** *старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага Союза музычных дзеячоў (Мінск, Беларусь)* | **Дыятанічныя цымбалы ў навучальным працэсе ўніверсітэта культуры: вопыт курсавога творчага калектыва «Этнасуполка» кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ** |
| ***Шчадрына Эвеліна,*** *магістр мастацтваў, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага Союза музычных дзеячоў (Мінск, Беларусь)* | **Дыятанічныя цымбалы ў навучальным працэсе: вопыт курсавога калектыву «Страла» кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ** |
| ***Хаменка Алег,*** *старшы выкладчык кафедры рэжысуры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага Союза музычных дзеячоў (Мінск, Беларусь)* | **Цымбалападобныя ўдарныя хардафоны на сучаснай рок-сцэне** *(даклад зачытаны калегамі)* |
| ***Папова Ірына,*** *дацэнт, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Санкт-Пецярбургскай акадэміі музыкі (кансерваторыі) імя М.А. Рымскага-Корсакава (Санкт-Пецярбург, Расія)* | **Цимбалы на Псковщине: музыкальный инструмент в традиционной культуре региона** *(даклад зачытаны калегамі, паколькі І. Папова рабіла сумесны з кафедрай этналогіі БДУКМ экспедыцыйны праект)* |
| ***Крамарэнка Кацярына,*** *настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па класе цымбалаў, Баранавіцкая Дзіцячая школа мастацтваў (Баранавічы, Беларусь)* | **Эвалюцыя цымбалаў у кантэксце беларускай і сусветнай мастацкай культуры** |
| ***Валатковіч Віктар,*** *дацэнт, загадчык кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, член Беларускага саюза музычных дзеячаў (Мінск, Беларусь)* | **Музычная спадчына Беларусі і яе канцэртна-сцэнічнае ўвасабленне ў творчай дзейнасці цымбальнага аркестра** *(даклад зачытаны калегамі)* |
| ***Гладкоў Яўген,*** *лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва; народны артыст Беларусі; прафесар; старшыня асацыяцыі цымбалістаў Беларусі і член Прэзідыума Праўлення Беларускага Саюза музычных дзеячаў; загадчык кафедры струнных, народных, шчыпкова-ўдарных інструментаў Беларускай дзяржаўнай Акадэміі музыкі (Мінск, Беларусь)* | **Канцэртна-выканальніцкая, мастацка-асветніцкая і вучэбна-метадычная дзейнасць членаў Беларускай асацыяцыі цымбалістаў** |

Крыху аб самой вандроўцы. Як ужо казалася раней, на XIV Міжнародны велікодны фестываль «Лобецка Баба» паехалі студэнты курсавых калектываў III і IV года навучання. Кафедра этналогіі і фальклору вядома з'яднанасцю і сяброўствам, што пацвердзілася і ў гэтай вандроўцы, дзе нам дапамаглі і першакурснікі (П. Кацярыніч з гурта «Ра́ме») і выпускнікі (магістрант ІПНК НАН Беларусі А. Белы). Атрыманых эмыцоцый і ўспамінаў нам хопіць як мінімум яшчэ на два курсы, а, магчыма (спадзяюся) – на больш доўгі час (мал. 1, 2).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Малюнак 1 – Студэнты I, III і IV курсаў на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, 2018



Малюнак 2 – Гурт «Страла» на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, Польшча, 2018





Малюнак 3 – Аўтары ідэі і арганізатары фэсту Д.А. Ледзіён і Б. Матлаўскі, 2018

Падчас вандроўкі арганізатары фестывалю падарылі студэнтам магчымасць не толькі пабачыць, але і пагуляць па беразе Балтыкі. Таксама важна адзначыць, што час правядзення фестывалю прыпаў на свята Вялікдзень. (мал. 3) Таму ўсе госці мелі гонар прыняць удзел у Велікодным шэсці.





Малюнак 3 – Велікоднае шэсце з удзельнікамі фестывалю «Лобецка Баба»



Малюнак 4 – Фальклорны гурт «Страла» на конкурсе ў Лобезе, 2018

Студэнты-фалькларысты двух курсаў БДУКМ паказалі высокі ўзровень майстэрства і прывезлі шматлікія ўзнагароды: Гран-пры конкурса атрымаў фальклорны гурт «Этнасуполка» (мал. 5) – IV курс, клас ст. выкладчыка Т. Пладуновай; III месца ў конкурсе калектываў – «Страла» (III курс), клас ст. выкладчыка Э. Шчадрыной (мал. 4); I месца ў конкурсе выканаўцаў на дыятанічных цымбалах – Галіна Вярэніч (IV курс) і III месца – Карына Курбака (III курс); дыплом лаўрэата конкурса – Дзмітрый Лебедзь-Хоміч (III курс) (мал. 6).



Малюнак 5 – Фальклорны гурт «Этнасуполка» – Гран-пры конкурса ў Лобезе, 2018







Малюнак 6 – Удзельніцы сольнай намінацыі: К. Курбака, Д. Лебедзь-Хоміч, Г. Вярэніч, 2018

Своеасаблівы «творчы дэсант» беларусаў у Памеранію 2018 года акрэсліў шэраг праблем, якія патрабуюць вырашэння: перапыннасць фальклорнай традыцыі (што мы заўважылі ў гуртах з іншых краін, арыентаваных на стылізацыю фальклору ды постфальклор, і пра што занепакоена казалі навукоўцы-ўдзельнікі канферэнцыі); слабы фольк-менеджмент і фінансавая падтрымка з беларускага боку (арганізавалі вандроўку нашы педагогі ўласнымі намаганнямі, а студэнты шукалі сродкі на дарогу, замест таго, каб займацца выключна творчай часткай праекта, паколькі менеджэраў, якія б займаліся арганізацыяй гэтага праекта, – не знайшлося). Але, будучыня – за моладдзю, таму мы будзем намагацца працягваць вывучэнне і папулярызацыю фальклору з улікам складанасцей і пераваг гэтай справы.

**Спіс літаратуры:**


1. Калацэй, В. Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск : Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – 116 с. : іл.
2. Померания [Электронный рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9F%D0%BE%D0%BC%D0%B5%D1%80%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D1%8F. – Дата доступу : 24.03.2018.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ